**АРАВА́**, археалагічны помнік — курганны могільнік на правым беразе р. Друць, за 0,5 км ад в. Арава Круглянскага р-на Магілёўскай вобл. 19 курганоў на ўзлессі і ў полі выш. 0,9—1,6 м, дыям. 5—10 м. Адкрыў у 1930 А.З.Каваленя. У 1967 З.М.Сяргеева даследавала 1 курган. Выяўлена трупаспаленне ў 3 урнах, змешчаных у драўляным зрубе: у 2 пахаваны па адным дарослым, у 1 — дзіця. Урны зроблены на ганчарным крузе, аздоблены хвалістым арнаментам. На адным з донцаў — таўро ў выглядзе 6-канцавой зоркі. Унутры зруба знойдзены 2 жал. нажы і бронзавы пярсцёнак з завязанымі канцамі. У 1989 В.Ф.Капыцін абследаваў могільнік. У 1993 Я.Р.Рыер даследаваў 3 курганы. Адзін з іх быў разрабаваны, у другім у перавернутым гаршку выяўлена трупаспаленне, зробленае па-за курганам. Над ім у насыпе — жал. сякера. Гаршчок-урна датуецца 11 ст. У цэнтры трэцяга кургана зафіксавана трупапалажэнне галавой на З у насыпе на зольнай падсыпцы. Пры нябожчыку знойдзены фр-ты жал. крэсіва і падкowападобнай спражкі са спіралепадобнымі канцамі (11—12 ст.). Над пахаваннем — фр-т пласцiністага пярсцёнка. За 2 м на З у насыпе выяўлена яшчэ адно пахаванне з зах. арыентацыяй, без рэчаў. Чарапы 2 нябожчыкаў — са слядамі пашкоджанняў.

*Літ.*: К а в а л е н я А.З. Археалагічныя росшукі ў вярхоўях рэк Друці, Усяж-Бук і Лукомкі // Працы. Т. 3; К о п ы т и н В.Ф. Археологические памятники Круглянского района Могилевской области. Могилев, 1991.

*Я.Р.Рыер.*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А.Кулешова